


ДЗВІНСКІ ЎЗГОРАК

*Кроч на свой родны,
дзвінскі ўзгорак,
каб глядзець
у будучую сінь*

ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ ГАЗЕТА ВІЦЕБСКАГА РАЁНА, №1 (143)
СТУДЗЕНЬ 2022 ГОДА

ГРАМАДСТВА

ХТО НЕ ЛІЧЫЦЦА ДАРМАЕДАМ

Хто ў Беларусі лічыцца дармаедам і калі пачынаць хваляваца супрацоўнікам ліквідаваных грамадскіх арганізацый?

Каток рэпрэсій у Беларусі, на жаль, не толькі не спыняецца, але і набірае абароты. За апошні год былі ліквідаваныя каля 300 арганізацый грамадзянскай супольнасці.

Тысячы беларусаў вымушаныя ўцякаць за мяжу. У такой сітуацыі надзвычай востра паўстаюць пытанні аб тым, ці не будуць супрацоўнікі ліквідаваных арганізацый адразу ж лічыцца дармаедамі, па якіх тарыфах давядзецца аплочваць камунальныя паслугі. Як плаціць падаткі, знаходзячыся за мяжой?

Падрыхтавалі адказы на гэтыя пытанні разам з юрысткай Анастасіяй Клешч.

Хто НЕ лічыцца дармаедам

Згодна з беларускім заканадаўствам дармаедамі не лічацца грамадзяне, якія:

1. Працуюць, знаходзяцца на дзяржаўнай службе або з’яўляюцца членамі вытворчага кааператыва або сялянскай (фермерскай) гаспадаркі.
2. З’яўляюцца індывідуальнымі прадпрымальнікамі.
3. Выконваюць працу па грамадзянска-прававых дамовах, прадметам якіх з’яўляецца выкананне работ, аказанне паслуг або стварэнне аб’ектаў інтэлектуальнай уласнасці.
4. Выконваюць іншыя віды дзейнасці і ўплочваюць адзіны падатак з ІП і іншых ФА (фізічных асобаў) — пры умове аплаты такога падатку за адпаведны перыяд.
5. Усе ваеннаслужачыя і ваеннаабавязаныя, асобы, якія праходзяць альтэрнатыўную службу — на перыяд гэтай службы.
6. Рамеснікі — пры ўмове аплаты пэўнага збору за адпаведны перыяд.
7. Асобы, якія з’яўляюцца ўласнікамі маёмасці (заснавальнікамі або ўдзельнікамі) камерцыйных арганізацый, за выключэннем акцыянерных таварыстваў.
8. Творчыя работнікі, статус якіх пацвярджаецца творчым саюзам, членам якога ён з’яўляецца, або прафесійным сертыфікатам творчага работніка.
9. Святары, асобы, якія навучаюцца ў духоўных навучальных установах.
10. Вырабнікі прадукцыі раслінаводства і жывёлагадоўлі на зямельным участку, які знаходзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь.
11. Асобы, якія зарэгістраваныя як беспрацоўныя, або праходзяць перападрыхтоўку.
12. Асобы, якія атрымліваюць адукацыю ў дзённай форме атрымання адукацыі.
13. З’яўляюцца маці або бацькам (мачахай або айчымам), усынавіцелем, апекуном або папячыцелем і якія выхоўваюць дзіця да 7 гадоў, дзіця-інваліда да 18 гадоў, тры і болей непаўналетніх дзяцей.
14. Спартсмены, уключаныя ў спісачныя склады нацыянальных і зборных каманд Рэспублікі Беларусь па відах спорту, а таксама асобы, якія з’яўляюцца спартсменамі-навучэнцамі спецыялізаваных навучальна-спартыўных устаноў.
15. Інваліды, незалежна ад групы.
16. Недзеяздольныя.
17. Асобы, якія атрымліваюць даходы ад здачы ў наём жылых і нежылых памяшканняў, машына-месцаў, — пры ўмове выплаты падаходнага падатку з фізічных асоб з такога даходу.
18. Асобы, якія працуюць за мяжой.
19. Асобы, якія атрымліваюць адукацыю за мяжой у дзённай форме атрымання адукацыі.

Дакументы, якія пацвярджаюць п.п. 18, 19 прадстаўляюцца на рускай або беларускай мове, або з афіцыйным перакладам.

Што з супрацоўнікамі ліквідаваных арганізацый

Асобы, якія былі звольненыя з працы — не лічацца дармаедамі наступны квартал, пасля звальнення, а калі звальненне было па скарачэнні колькасці або штата работнікаў ці па стане здароўя — 6 месяцаў. Тое ж самае датычыцца і ліквідаваных арганізацый.

Асобы, якія былі звольнены ў сувязі з ліквідацыяй арганізацыі, не лічацца дармаедамі наступны квартал.

Асобы, якія былі сябрамі творчых арганізацый, не лічацца дармаедамі цягам квартала з моманту ліквідацыі. Афіцыйнай датай ліквідацыі арганізацыі лічацца яе выключэнне з рэестру юрыдычных асоб Беларусі.

budzma.org

Чытайце сайт Віцебскага раёна:
http://vicebskreg.by

МАЁМАСЦЬ

ИМУЩЕСТВО В ОБОРОТ

Многие объекты продают на аукционах, в том числе за одну базовую величину. Такие условия особенно выгодны тем, кто хочет организовать или расширить свой бизнес, ведь строительство здания под производство — дело затратное и хлопотное.

Как рассказали в отделе экономики Витебского райисполкома, принимаемые меры и лояльные законы, ориентированные на привлечение инвесторов, дают определенный результат. Так, в 2021 году нашли своих новых владельцев такие неиспользуемые объекты, как детские сады в Задубровье и Присушино, административное здание в Больших Летцах. Причем выкупали их и физические, и юридические лица, что свидетельствует о заинтересованности индивидуальных предпринимателей и предприятий разной формы собственности в развитии бизнеса в сельской местности. Сегодня на территории района работает немало предприятий, которые сумели организовать и развивать дело, вложив финансовые средства именно в реконструкцию невостребованных объектов государственной недвижимости.

В Витебском районе еще достаточно неиспользуемых зданий, которые ждут своих новых хозяев. Все они могут быть вовлечены в хозяйственный оборот, многие использованы в качестве объектов агроэкотуризма, придорожного сервиса, производственных помещений и складов, отмечает начальник отдела экономики Витебского райисполкома Леонид Михайлов. Наши предложения выгодны для инвесторов, ведь по территории района проходят крупнейшие автодороги, немалую роль играют уникальный природный ландшафт и близость к областному центру, наличие местных ресурсов в виде леса, доломита, строительных песков, торфа, минеральных вод и необходимых объемов разведанных минерально-сырьевых ресурсов. Все это в совокупности делает Придвинский край привлекательным.

Сейчас есть выгодное предложение для субъектов торговли и крупных ритейлеров, отмечает Леонид Сергеевич. В поселке Витьба могут быть сданы в аренду площади выкупленного индивидуальным предпринимателем объекта для организации в нем торговой деятельности, что весьма актуально для жителей этого населенного пункта. Ранее покупательский спрос здесь удовлетворяла потребительская кооперация, сейчас жители Витьбы (более 400 человек), а также работники Витебского клинического центра психиатрии и наркологии, исправительного учреждения и члены садовых товариществ заинтересованы в магазине продовольственных и промышленных товаров.

Владелец здания провел большую работу по его преображению: полностью заменены окна, сделана перепланировка, выполнены внутренняя и внешняя отделка, проведено газовое отопление. Объект расположен вблизи автодороги Р-112, до Витебска рукой подать. Рядом расположены складские помещения, есть площадка для парковки.

К слову. Вся информация о предлагаемых к продаже объектах недвижимости и объявленных аукционах размещена на сайте райисполкома.

«Витьбичи»
Светлана ЛЮБОЧКА

СЕЛЬСКАЯ ГАСПАДАРКА

ПТИЧНИКИ В ХАЙСАХ

Александр Субботин проинспектировал строительство новых птичников в Витебском районе.

В «Хайсах» работают чуть более 50 человек, которые выращивают 30 тыс. индюшат. Перед коллективом ставится задача нарастить производство мяса индейки с 1,5 тыс. до 2 тыс. т. Это заставляет руководство участка во главе с Александром Тасминским увеличивать производственные мощности и вводить в строй после реконструкции новые птичники. Так, до марта здесь собираются заселить индюшат в три обновленных помещения. Одно из них, где будут содержаться 6 тысяч 42-45-дневных птиц, заработает в ближайшее время. В помещение подведен газ, завершены пусконаладочные работы системы газоснабжения и микроклимата, произведено утепление и установлено необходимое оборудование. Параллельно ведутся дополнительные ремонтные работы в двух других птичниках. На реконструкцию птичников в прошлом году направлено 500 тыс. руб.

Индюшатина хотя и считается во всем мире востребованным продуктом, у нас этот сегмент освоен недостаточно, подчеркнул Александр Субботин. Есть вопросы по реализации мяса индейки, которое считается диетическим. Дальнейшее развитие производства птицы на участке «Хайсы» послужит импульсом в развитии северного региона и будет содействовать наращиванию экспортного потенциала.

ЕЛЕНА БАШУН
vitvesti.by

КУЛЬТУРА

ЦАЦКІ І ПАШТОЎКІ Ў КАЛЕКЦЫІ

Больш за паўтары тысячы навагодніх цацак і паштовак сабрана ў калекцыі музея «Гісторыя Заронаўскага краю».

Захавальнік музейных каштоўнасцей Людміла Нікіціна з радасцю дзеліцца экспанатамі для выстаў з бібліятэкамі і ўстановамі дадатковай адукацыі.

Такой вялікай колькасці распаўсюджаных і ўнікальных цацак пазайздросцяць абласныя музеі.

Адных Дзедаў Марозаў тут больш за 60, але ні адзін з іх непадобны да другога. Зробленыя з ваты, цыраты, гумавыя і нават драўляныя — белабародыя чараўнікі захапляюць не толькі дзяцей, але і дарослых. Больш за дзесяць Снягурачак, дарэчы, такая ўнучка-памочніца была толькі ў рускага Дзеда Мароза. Прадстаўлены на паліцах у калекцыйнай зале і замежныя Дзяды — Санта Клаус, Пэр-Наэль, Йоўлупукі.

Калі ў СССР у 1935 годзе дазволілі святкаваць Новы год, першыя елачныя ўпрыгожванні дзеці з бацькамі рабілі самі з ваты і клею, часцей гэта была садавіна і гароднiна, пасля — птушкі і жывёлы. Пасля выхаду фільма «Карнавальная ноч» з'явіліся гадзіннікі «без 5 хвілін 12», яны розных колераў і памераў таксама прадстаўлены ў экспазіцыі. Калі ва ўладзе быў Хрушчоў, цацкі ў выглядзе кукурузы і морквы з'явіліся на елках у кожным доме. Дырыжаблі і касмічныя караблі са шклярусу былі абумоўлены палётам у космас Юрыя Гагарына — пра гэтыя цікавыя факты навагодняй гісторыі вядзе аповед Людміла Нікіціна разам з юнымі экскурсаводамі.

Шырока ў калекцыі прадстаўлена інтэр-нацыянальная тэматыка, народы свету паказаны ў класічных нацыянальных касцюмах. Захапляюць і ўсім вядомыя казачныя персанажы Пушкіна на прышчэпках, выпушчаныя да 150-годдзя са дня нараджэння паэта ў 1949 годзе. Беражліва захоўвае Нікіціна і самаробныя елачкі — творы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва сваіх былых вучняў і іх бацькоў. Чаго тут толькі няма: макаронныя лясныя прыгажуні, дрэўцы з ваты, цукерак і каляровых пацерак.

У калекцыі паштовак, якія трапілі на Беларусь напрыканцы XIX стагоддзя, ёсць асобнікі, датаваныя 1912, 1916, 1919 гадамі. Унікальныя экспанаты — паштоўкі перыяду вайны 1942-43 гадоў, шмат навагодніх, прысвечаных дзяржаўным святам, артыстам кіно і эстрады.

У святочныя дні навагодняя калекцыя карыстаецца вялікім попытам у зацікаўленых наведвальнікаў, таму музей няспынна працуе на радасць усім жыхарам раёна.

Аляксандра ПОБАЧ
"Жыццё Прыдзвіння"

ЗДАРЭННЕ

КАТАЛИСЬ НА ТЮБИНГЕ

Девочка получила травмы головы, катаясь на тюбинге в Витебском районе.

Пятилетнюю девочку доставила в больницу бригада скорой помощи.

Ребенок получил травмы во время катания с горки на тюбинге. По предварительной информации, девочка в это время находилась со своей матерью. Во время спуска они не удержались на поверхности, и тюбинг перевернулся. Девочку госпитализировали в нейро-хирургическое отделение Витебской областной клинической больницы. Сообщение об этом поступило в Витебский РОВД вечером 9 января. По факту случившегося правоохранители проводят проверку.

Как отметил старший инспектор по особым поручениям управления охраны правопорядка и профилактики УВД Витебского облисполкома подполковник милиции Роман Бардеев, катание на тюбингах и других подобных средствах это довольно опасный вид развлечений. Несмотря на предупреждения родителей об этом, каждый год в Витебской области регистрируются случаи детского травматизма, которые связаны с подобными снежными забавами. Все из-за того, что тюбинги способны развивать большую скорость и закручиваться во время спуска. При этом они неуправляемы и не оснащены тормозным устройством.

Чтобы сделать катание на тюбинге безопасным, необходимо придерживаться нескольких правил:

кататься только в строго отведенном для этого месте;

перед спуском с горки убедиться, что на пути нет людей;

нельзя соединять несколько тюбингов;

опасно садиться на тюбинг вдвоем - из него можно вылететь;

место для спуска должно находится вдалеке от проезжей части дороги.

А.Адамов

СМАЧНА ЕСЦІ

ЦІКАВЫЯ РЭЦЭПТЫ ДРАНІКАЎ

З тварагом, журавінамі і на яловай калодзе. Дранікі (драчонікі, дзеруны) — іх не любіць немагчыма! Нездарма яны з'яўляюцца адной з самых папулярных страў беларускай нацыянальнай кухні.



Падобныя на нашыя бліны з бульбы гатуюць і ў іншых кухнях (украінскай, польскай, нямецкай, нават амерыканскай), і ў кожнай — свае сакрэты. Такія кулінарныя сакрэты ёсць і на Прыдзвінні.

Прапануем здзейсніць невялікае, але вельмі смачнае падарожжа ў гарадок Мазалава Віцебскага раёна і даведацца пра рэцэпты ад мясцовых жыхарак — майстрыц з народнага жаночага клуба «Залаты ўзрост», актыўных удзельніц шматлікіх мерапрыемстваў з выставай-дэгустацыяй страў нацыянальнай кухні, дзе галоўнае месца займаюць тыя самыя дранікі.

Гаспадыня Таццяна Гардзіенка сваім фірменным рэцэптам лічыць дранікі з тварагом. Для іх прыгатавання неабходна бульбу надзерці на мелкую тарку, потым адціснуць праз сіта ці марлю. Затым дабавіць крухмал з адціснутага бульбянога соку і тварог любой тлустасці. Прапорцыя бярэцца любая. Далей абвязкова пакласці пару зубкоў часнака і крыху кропу, яйка, соль па смаку. Выпякаць аладкі трэба на сланечнікавым алеі з абодвух бакоў.

На святы ў населеных пунктах Мазалаўскага сельсавета пякуць бульбяныя аладкі на яловай ці сасновай калодзе.

На ёй робіцца чатыры надрэзы для таго, каб у сярэдзіну пакласці смалякі, паперу для распальвання. Пакуль мужчыны распальваюць калоду, гаспадыні замешваюць цеста. Пякуць аладкі на чыгуннай патэльні. Такі рэцэпт прыгатавання ведае жыхарка вёскі Хайсы Святлана Тузікава. 10 бульбін трэба надзерці на мелкай або сярэдняй (сырнай) тарцы. Затым адціснуць і хуценька дабавіць крыху малака, каб цеста не пацямнела. Далей націраецца тры вялікія цыбуліны на бурачнай тарцы і змешваюцца з бульбай. Абавязкова трэба ўсыпаць у замес дзве сталовыя лыжкі мукі, дабавіць соль і перац па смаку, два зубкі часнака, прапушчаныя праз часночніцу. Можна дабавіць адно яйка. Накладваецца прыгатаваная маса на патэльню дэсертнай лыжкай. Пякуцца бульбяныя аладкі ў вялікай колькасці алею з абодвух бакоў. Падаюцца на стол са смятанай, мачанкай ці зажаркай са шкварак і цыбулі.

Традыцыю вырабу лялькі з дранікаў, якую пераняла ад сваёй бабулі Аляксандры Фёдараўны Нікіфаравай з вёскі Сакольнікі, захоўвае Ала Антаненка. «Бульбяначку» Ала Мікалаеўна гатуе на сямейныя святы, і яна заўсёды займае цэнтральнае месца на стале сярод іншых страў. Для асновы лялькі выкарыстоўваецца драўляны брусочак, каб яна трывала стаяла. Для прыгажосці і рознакаляровасці гаспадыня выпякае разнастайныя па форме і колеру бліны і аладкі. Бульбяное цеста дзеліцца на чатыры роўныя часткі. У першую дабаўляецца сыры цёрты на сярэднюю тарку бурачок, у другую — сырая цёртая морква, у трэцюю — прыправа куркума, у чацвёртую — мелка пакрышаны кроп і сок шпіната. З прыгатаваных бліноў і аладак збіраецца лялька.

Спадзяюся, што вам было вельмі смачна!

«Витьбичи»
Андрэй СТРУНЧАНКА

АДПАЧЫНАК

ЗИМНИЕ ЗАБАВЫ В НОВКЕ

ФСК «Урожай» Витебского района приглашает любителей фигурного катания и хоккея.

Январь — самое подходящее время, чтобы после новогодних праздников вдоволь насладиться зимними забавами.

Катание на коньках на водоемах — небезопасное развлечение, особенно в период изменчивых погодных условий. Отличной альтернативой являются искусственно залитые катки, которые отличаются не только ровной ледяной гладью, но и существенно снижают вероятность возникновения чрезвычайных ситуаций.

С началом зимы на территории ФСК в аг. Новка не смолкают задорные голоса. Клуб предлагает всем желающим услуги проката коньков, размерный ряд которых от 34 до 46 размера. Для взрослых любителей и профессионалов фигурного катания такая услуга на час стоит 5 рублей, для подростков 13-17 лет — 3 рубля, детям до 12 лет — 2 руб. А те, у кого спортивный инвентарь с лезвиями имеется дома, могут абсолютно бесплатно в любое время посетить каток. После школы в хоккейной коробке немало мальчишек, которые с удовольствием гоняют шайбу, и малышей, которые неуклюже скользят по льду пока еще в ботинках. Несколько лет назад «Урожай» приобрел коньки за счет собственных внебюджетных средств, они регулярно затачиваются и проходят необходимый ремонт, а услуга проката уже давно полюбилась местному населению.

Директор клуба Наталья Мацкевич отмечает, что прокат пользуется популярностью среди молодежи, особенно в вечернее время и выходные дни. Несмотря на то, что в Витебске функционируют большие катки, новкинская ледовая площадка пользуется большим спросом у любителей зимних развлечений.

В 2021 году техническая база спортивного клуба благодаря финансовой поддержке райисполкома пополнилась новеньким снегоходом «Буран», который играет ключевую роль во всех спортивных соревнованиях района зимой. С его помощью нарезают лыжную трассу в Новке, подготавливают лыжню для «Снежного снайпера», приводят в порядок хоккейную коробку к сезону. Отличительно, что в нашем регионе, в котором нет специализированных горно-лыжных комплексов, имеется такой транспорт. Работники ФСК между собой называют его «буранчиком», подчеркивая практичность и необходимость.

Скоро зима передаст свои права весне, поэтому поспешите на каток, чтобы получить заряд здоровья и позитивных эмоций!

Александра ГВОЗДЕВА
"Жыццё Прыдзвіння"

ПРАЕКТ

ІГАР БАРЫСАЎ: ПРАЕКТ КАНСТЫТУЦЫІ НЕ АДПАВЯДАЕ ЧАКАННЯМ БЕЛАРУСКАГА НАРОДА

Старшыня Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Грамада), палітолаг Ігар Барысаў выказаўся адносна праекта Канстытуцыі, які прапаноўваецца вынесці на рэферэндум.



Ігар, як пракаментуеце праект, які быў апублікаваны дзяржаўнымі СМІ?

Відавочна, што фраза Аляксандра Лукашэнкі «я свой народ за цывілізаваным светам не павяду» у гэтым праекце Канстытуцыі набывае сапраўдную моц. Адзін з беларускіх прапагандыстаў падкрэсліў, што мы перастаем капіраваць іншыя практыкі арганізацыі грамадства і ствараем сваю. У гэтай сувязі я адразу ўзгадваю Муамара Кадафі з яго непаўторнай джамахірыяй. Такога палітычнага ўладкавання не было і наўрад ці будзе яшчэ хоць у адной з краін свету. Тое, што стваралася лівійскім дыктатарам як нешта арыгінальнае — атрымалася вычвурным і эксцэнтрычным. Акрамя таго, у беларускім праекце Канстытуцыі знаходзяцца агульныя рысы з кітайскай мелітакратыяй. Там таксама ёсць Усекітайскі сход народных прадстаўнікоў, які мае заканадаўчыя функцыі, збіраецца раз на год і г.д. Так што назваць праект беларускай Канстытуцыі арыгінальным можна, аднак каб быць аб'ектыўным варта акрэсліць яго, як эксцэнтрычна арыгінальным.

Якія змены прапануе зрабіць улада?

У першую чаргу зрабіць усё магчымае, каб выключыць апанентаў з актыўнай фазы любой выбарчай кампаніі, а таксама зрабіць меншую колькасць выбарчых кампаній, праз стварэнне адзінага дня галасавання па выбарах у мясцовыя Саветы дэпутатаў і Палату прадстаўнікоў з прадаўжэннем паўнамоцтваў дзеючых дэпутатаў на 5 год. У ідэале ідэя адзінага дня галасавання добрая, аднак яна кампенсуецца эксцэнтрычнай арыгінальнасцю — выбары павінны адбывацца ў апошні тыдзень лютага. Для тых, хто займаецца выбарчымі кампаніямі не адзін год зразумела, што ніхто ў маразы не будзе займацца зборам подпісаў ці агітацыяй на вуліцы. Такім чынам гасіцца любая вулічная актыўнасць ў часе выбарчай кампаніі. Прымальнымі чысламі для адзінага дня галасавання з'яўляюцца другія, трэція, ці чацвёртыя выхадныя верасня.

Прапануюцца ўзроставыя абмежаванні да кандыдата на пасаду Прэзідэнта. Прапануецца, што з 40 год можна ўдзельнічаць у прэзідэнцкіх выбарах. На маю думку, гэтай нормай адсякаюцца маладыя палітычныя лідары, якія з'явіліся ў часе мінулай выбарчай кампаніі.

Акрамя таго, прапануецца абмежаванне на ўдзел у выбарах для тых, хто пэўны час жыў у іншай краіне — кандыдат на пасаду Прэзідэнта павінен пражываць на тэрыторыі Беларусі цягам апошніх 20 год. Гэта фактычна накіравана на тых, хто вымушаны быў з'ехаць з Беларусі за апошнія 1,5 гады.

Таксама прапануецца норма, аб спыненні грамадзянства. Фактычна яна дае права любога свайго палітычнага апанента пазбавіць беларускага грамадзянства і зараз яна патэнцыйна можа быць накіраваная супраць дзеячаў беларускай эміграцыі, якія стварылі свае палітычныя цэнтры. Такую норму практыкаваў нямецкі Трэці Рэйх. Варта ўзгадаць, што сацыял-дэмакрат Вілі Брант быў пазбаўлены грамадзянства, аднак пасля краху нацыскай Германіі ён здолеў стаць яе канцлерам…

Што дзяржава гарантуе працоўным?

У новай рэдакцыі Канстытуцыі яна ўжо не дае права прымаць удзел працоўным у кіраванні прадпрыемствамі і ўстановамі, як гэта было раней. Хоць гэта на практыцы і не выконвалася, аднак такая норма існавала.

Таксама ўводзіцца норма аб сацыяльнай адказнасці, ўнясенні пасільнага ўклада ў развіццё грамадства і дзяржавы. Гэта фактычная легалізацыя дэкрэта аб дармаедах.

Ёсць яшчэ адзін дадатак, дзе бацькі абавязаны рыхтаваць дзяцей да грамадска карыснай працы. Гэта шырокая фармулёўка. Пакуль не зразумела, што яна мае на ўвазе, але зразумела, што яна стане фармальнай нагодай, каб прыцягваць да адказнасці бацькоў за дзеянні дзяцей.

Ці ўзмацняецца роля ідэалогіі?

Асобным пунктам прапісваецца, што дзяржава забяспечвае захаванне гістарычнай праўды і памяці аб гераічнай перамозе беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны. У Беларусі гэты пункт выглядае крыху дзіўнаватым, бо Беларусь была ўцягнута ў Другую сусветную вайну ў 1939 г., а ВАВ гэта ўсяго толькі яе частка. Таму бачым, што гэта робіцца невыпадкова, а каб праваахоўным структурам развязаць больш рукі і пераследваць за гістарычныя даследванні, якія не адпавядаюць агульнай ідэалагічнай лініі. Фактычна пад гэта можна падвесці забарону на ўжыванне бел-чырвона-белага сцяга, бо раней афіцыйная прапаганда ўжо лямантавала, што нацыянальны сцяг выкарыстоўвалі калабарацыяністы, хоць доказаў гэтаму няма.

Ёсць таксама пункт, што праяўленне патрыятызма, захаванне гістарычнай памяці аб гераічным мінулым беларускага народа з'яўляюцца доўгам кожнага грамадзяніна Рэспублікі Беларусь. Вось у гэтым пункце, хутчэй за ўсё, будзе давацца ацэнка той ці іншай гістарычнай постаці. Напрыклад Касцюшка дрэнны, а вось Сувораў добры і г.д. Калі нешта спрабуеш даказаць адваротнае — не праяўляеш патрыятызму.

Так а хоць што-небудзь станоўчае ў новым праекце Канстытуцыі ёсць?

Я бы сказаў, не станоўчае, а нейтральнае, бо ўсе станоўчыя прапановы стануць пры гэтай уладзе праз правапрымяняльную практыку ў лепшым выпадку нейтральнымі.

Калі казаць з пазіцыі сацыял-дэмакратаў, то скасоўваецца тлумачэнне існуючай адміністрацыйна-тэрытарыяльнага ўладкавання дзяржавы. Выкрэсліваецца, што тэрыторыя дзеліцца на раёны, гарады, вобласці і іншыя адміністрацыйна-тэрытарыяльныя адзінкі. Гэта дае магчымасць правесці рэформу і прыняць новы закон аб адміністрацыйна-тэрытарыяльным абладкаванні. Мы маем такую канцэпцыю…

Уводзіцца магчымасць падаваць у суд на рашэнне і дзеянні (бяздзеянні) дзяржаўных органаў і службовых асоб, якія парушаюць правы і свабоды. Раней такога не было. Мы маем гатовы законапраект….

Прэзідэнцкія паўнамоцтвы абмяжоўваюцца двума тэрмінамі, але ёсць адна асаблівасць — Прэзідэнт можа быць старшынёй Усебеларускага народнага сходу адначасова, а тэрміны прэзідэнцкіх паўнамоцтваў могуць адлічвацца наноў для таго, хто зараз займае гэтую пасаду. Гэтаксама старшыня Усебеларускага народнага сходу (будучы былым Прэзідэнтам) пажыццёва ўваходзіць у Савет Рэспублікі. Гэта дае магчымасць аднаму чалавеку сядзець на некалькіх крэслах адначасова, што канцэнтруе ў яго руках дадатковыя паўнамоцтвы….

Даюцца некаторыя нейтральныя карэкціроўкі існуючых раней пунктаў, але яны з'яўляюцца касметычнымі.

Што можна сказаць падсумоўваючы?

Тое, што ні старая, ні новая Канстытуцыя не аблягчаюць жыццё грамадзян. Людзі чакалі зменаў, а атрымаюць рэакцыйныя змены з яшчэ большай канцэнтрацыяй улады. Тым больш ведаючы, што «не да законаў» зараз — «не да законаў» будзе і пасля і ўсё гэта выглядае як унутраныя правілы пераразмеркавання ўлады ўнутры наменклатуры, аднак з гэтых працэсаў (стварэнне альтарнатыўных праектаў, шырокае абмеркаванне існуючага, вылучэнне ў камісіі і назіранне, свабодны і справядлівы падлік галасоў) выключаны грамадзяне і палітычныя партыі.

Усебеларускі народны сход — гэта стварэнне нейкага абсалюту, куды прапануецца загнаць прадстаўнікоў усіх трох галін улады і мясцовай вертыкалі ўлады. У ідэале ўсе гэтыя тры галіны ўлады павінны ураўнаважваць адна адну і стрымліваць, а не згладжваць супярэчнасці, бо калі іх не будзе — не будзе ні дынамікі, ні прагрэсу.

Немагчыма адказаць на пытанне — што ж гэта такое за Усебеларускі народны сход, якая гэта галіна ўлады? Трэцяя палата парламенту, ці абсалютная ўлада бюракратыі, бо нехта паза сістэмай патрапіць дэлегатам не здолее, бо відавочна, што выбары дэлегатаў будуць ускоснымі.

Адным словам нічога добрага нас у гэтай рэдакцыі Канстытуцыі не чакае. Уплываць на яе прыняцце ніхто не можа, бо пад выглядам контррэвалюцыі ўлада прасоўвае патрэбныя для яе змены.

З праектам канстытуцыйных пераўтварэнняў з пазіцыі БСДП можна азнаёміцца па спасылцы.

(скарочана)

Прэс-служба БСДП
www.bsdp.org

ЛІКВІДАЦЫЯ

ВЫЖЖЕННАЯ ЗЕМЛЯ

По состоянию на 1 января 2022 года было известно о 309 белорусских некоммерческих организациях, которых коснулась принудительная ликвидация.

Владимир МАКЕЙ, министр иностранных дел Республики Беларусь:

— Кто-то говорит, что у нас диктатура, но, поверьте, мы заинтересованы в том, чтобы существовало альтернативное мнение. Более того, мы заинтересованы в том, чтобы и гражданское общество смелее высказывало какие-то свои инициативы и альтернативные точки зрения. Общеизвестно, что в споре рождается истина...

У нас готовы слушать и слышать альтернативное мнение гражданского общества. Но понятно, что это мнение должно быть конструктивным и нацеленным на сохранение государственности Беларуси, поступательное развитие государства и общества.

БЛИЦ-КОММЕНТАРИЙ

Министр иностранных дел Владимир Макей взывает: «Поверьте!» Но он не священник и не проповедник, а мы не адепты его секты, чтобы просто верить словам. Мы должны апеллировать к фактам.

А факты свидетельствуют об обратном.

Вся вторая половина минувшего года в Беларуси прошла под знаком ликвидации структур гражданского общества. Причем показательно, что еще 30 июля 2021 года Александр Лукашенко заявлял о выявлении 185 «деструктивных структур». Но в итоге план по ликвидации НГО был не только выполнен, но и существенно перевыполнен.

По состоянию на 1 января 2022 года было известно о 309 белорусских некоммерческих организациях, которых коснулась принудительная ликвидация. В маховик репрессий попали НГО вне зависимости от направления и характера деятельности. Это и культурные организации, и просветительские, и правозащитные, и экологические, и исследовательские, и по защите прав потребителей, и социальные, и другие.

Какой «деструктив» несло «Таварыства беларускай мовы», которое занималось пропагандой белорусского языка?

Что крамольного было в деятельности Союза белорусских писателей, Белорусской ассоциации журналистов, Университета имени Нила Гилевича, «Таварыства беларускай школы», Гродненского детского хосписа, курсов белорусского языка «МоваНанова» и многих-многих других?.. Они что, пропагандировали войну, раздавали наркотики, нелегально обучали взрывному делу? Они работали на благо белорусов, заполняя те ниши, до которых у государства не доходили руки. В этих организациях объединялись люди без всякого приказа, по воле души. Государство посчитало опасным именно это?

Свою пламенную речь с призывом «Поверьте!» министр Макей адресовал непонятной делегации общественных активистов из Литвы. Однако он

(працяг на стар. 4)

ЛІКВІДАЦЫЯ

(пачатак на стар. 3)

наверняка забыл упомянуть, что в числе прочих в Беларуси были ликвидированы и культурно-историко-просветительская городская общественная организация «Объединение литовцев «Витис» в Минске, и Лидское общественное объединение литовцев «РУТА». Причем ни к политике, ни к протестам эти организации отношения не имели, они просто пытались помочь белорусским литовцам сохранять связь со своими корнями. И это крамола? Это «деструктивная деятельность»?

Наверняка не рассказал Владимир Макей своим гостям и про то, что многие общественные организации в Беларуси теперь закрываются сами. Потому что политика государства сформулирована предельно понятно: «Не высовываться!» Государство создает условия только для тех, кто работает под его крылом и кормится с его руки. Остальные в сегодняшней Беларуси фактически причислены к врагам.

«Смелее! — говорит Макей. — Государство заинтересовано в инициативах».

При этом в Уголовном кодексе для особо инициативных уже заготовлено наказание за действия от имени незарегистрированной организации.

«Смелее! — говорит Макей. — Государство заинтересовано в альтернативной точке зрения».

При этом независимые СМИ разгромлены, объявлены экстремистскими, сайты заблокированы, многие журналисты в тюрьме либо в эмиграции.

После президентских выборов государство применило к негосударственному сектору тактику выжженной земли. А теперь министр заявляет: «Общеизвестно, что в споре рождается истина». О чем это он? О какой Беларуси? О спорах между Азарёнком и Гигиным?

Если государство заинтересовано в дискуссиях по важным вопросам, почему мы не видим этого в государственных СМИ — на ТВ, в газетах, на радио? На экранах, в эфире, на страницах изданий одни и те же надоевшие лица. Они вбивают в головы электората одни и те же демагогические мысли. Никакой полемики, никакого разномыслия, никаких свежих взглядов на происходящие события и на будущее страны.

Если в споре рождается истина, то почему к разработке проекта новой Конституции не были подключены оппоненты действующей власти? Почему дискуссионные площадки превратились в междусобойчик под надзором идеологов?

Выпустите из тюрем тех, кто не побоялся выступить против фальсификации результатов голосования на президентских выборах. Дайте гарантию безнаказанного возвращения из-за границы многих тысяч белорусов, которые из-за жутких репрессий вынуждены были уехать в разные страны. Что, мнение этих людей по судьбоносным проблемам вам, господин Макей, не интересно? Жаль, что власти, которые олицетворяете и вы, Владимир Владимирович, считают их врагами народа. Но в истории подобное встречалось. И не сделать ли нужных выводов?

Вы говорите: «Готовы слушать и слышать». Где, господин министр? В следственном изоляторе, в тюрьме, на допросе?

Без сомнения, каждому из нас хотелось бы жить в такой Беларуси, о которой говорит Владимир Макей. Но, к сожалению, пока она существует только в речах министра иностранных дел для внешней презентации.

Публикация из № 6 газеты «Народная Воля»

www.nv-online.info

РАСІЯ

КРЕМЛЬ В ОВЕЧЬЕЙ ШКУРЕ

Всё большую актуальность вновь приобретает анекдот времен гонки вооружений. Леонид Брежнев выступает в ООН и говорит: «Нам нужен мир». А потом добавляет: «Желательно весь». Примерно так сегодня выглядят внешнеполитические инициативы России.



Кремлевские пропагандисты пытаются натянуть на медведя овечью шкуру. РИА Новости в статье «Коллективная опасность: соседи России — под ударом Запада» пишут:

«Трупы на опустевших улицах, сожженные здания и автомобили, хаос, разбой — именно в такие витрины американские партнеры планируют превращать бывшие республики СССР. В ближайших планах наших американских партнеров — развалить абсолютно все анклавы цивилизации, еще сохранившиеся на окраинах бывшего СССР».

Ни единого доказательства существования этих темных планов по традиции не приводится. Зато на контрасте малюется «светлый образ»:

«Это русские заинтересованы в том, чтобы вдоль их границ цвели сто цветов и мирно жили сильные и независимые государства. Несмотря на все легенды и мифы национальных окраин, именно Россия веками несла цивилизацию в эти богом забытые уголки Земли. И только она заинтересована сегодня в том, чтобы обеспечивать их безопасное развитие. Для наших западных партнеров все это просто недогосударства».

О да, так «несла цивилизацию» (одни сталинские репрессии чего стоят), что многие «осчастливленные» при первой возможности стали дистанцироваться от России и искать счастья в Евросоюзе или где-нибудь еще. И это неудивительно: ведь даже в цитируемом абзаце сквозит имперское высокомерие по отношению к соседям: «национальные окраины», «богом забытые уголки Земли»!

Кто считает Беларусь, Украину и далее по списку «недогосударствами» вполне очевидно из высказываний высшего российского руководства. *«Западным партнерам» пытаются приписать сказанное как раз Владимиром Путиным: **«Украина — это даже не государство!»***

Да и само РИА Новости в другой статье пишет:

«Восстановление геополитического контроля России над постсоветским пространством действительно произойдет — можно называть это возрождением СССР, мы же будем говорить о строительстве Евразийского союза... Потому что восстановление российского геополитического пространства (не говоря уже о возвращении Украины) — это не прихоть Путина и не гегемонистские замашки Москвы, а восстановление естественного хода отечественной истории. Мы ничего ни у кого не забираем, мы лишь восстанавливаем временно утраченное».

Овечья шкура быстро треснула по шву и из-под неё проступили хорошо знакомые очертания хищника. Все постсоветские государства, по версии агентства, это не более, чем «временно утраченное российское геополитическое пространство». С таким отношением стоит ли удивляться, что соседи смотрят на Кремль, как минимум, настороженно. Испортить, если не навсегда, то очень надолго, отношения с Украиной – это надо было умудриться. И сейчас, конечно, можно бахвалиться о её возвращении на бумаге, однако на практике миссия выглядит невыполнимой.

Остаются, конечно, чисто силовые методы. Но как они стыкуются с образом «миротворца»? Оказывается, легко – даже в рамках одной статьи.

«Москва три десятилетия стремится к снижению военной напряженности в Европе и в мире, – утверждает Спутник-Беларусь. – Вашингтон 30 лет безрассудно подталкивает Североатлантический альянс к расширению на восток и военному освоению постсоветского пространства, включая Украину. На этом историческом фоне постоянный представитель США при НАТО Джулианна Смит 10 января заявила: «Россия, по сути, была главной угрозой европейской безопасности в последние два десятилетия». Не пора ли вызывать «санитаров» из ведомства Сергея Шойгу?

РФ оставляет за собой суверенное право на односторонние военные меры для защиты национальной безопасности».

«Снижение военной напряженности» посредством «односторонних военных мер» – неплохо, да? Откусить Крым у Украины и потом деланно возмущаться, что Россию считают главной угрозой европейской безопасности? Рядиться в тогу миротворца и грозить отправкой своих военных к постпреду США при НАТО? Тут «санитары» нужны, возможно, тому, у кого всё это умещается в одной голове и заметке.

А вот прекрасный пример, когда цели и задачи формулируются без обиняков и условностей. Телеграм-канал Россия – не Европа требует:

«Россия должна ликвидировать опасность включения Украины в НАТО «операцией принуждения к миру», «благо» ВСУ постоянно стреляют по Донбассу, где проживает уже 600 тыс. россиян, гибнут люди. На этот раз нельзя остановиться, как остановились в 2008 г. в Грузии. Пункт остановки – венгерская и польская границы. Никаких планов на отказ от Западной Украины не должно быть».

Тут волк уже даже не пытается маскироваться. Можно, конечно, попытаться списать агрессивные устремления на частное мнение автора канала. Но российские государственные мужи выражаются не менее агрессивно. В январе вице-спикер Госдумы Петр Толстой заявил, что Россия должна быть восстановлена в границах Российской империи. Причем речь шла не только об Украине, но и о Финляндии!

Но результат «боевых действий», которые ведут «батальоны политруков» – обратный. Нейтральная Финляндия задумалась о вступлении в НАТО. Да и другие государства перспектива войти в состав империи не соблазняет.

«Кремлевские соловьи» оказывают своим хозяевам медвежью услугу. Такая пропаганда не способна овладеть ни умами, ни сердцами.

Михаил Брошин

gazetaby.info

Заснавальнік і рэдактар: Смолікаў Канстанцін Эдуардавіч

Адрас рэдакцыі: г. Віцебск, вул. 1-я Сенёнская д.5, Тэл. +375-29-218-98-38, e-mail: kas_vit@tut.by
Газета выдаецца з лютага 2014 г.

Падпісана да друку 28.1.2022 у 16.20
Наклад: 290 асобнікаў.
Выдаецца адзін-два разы на месяц на беларускай і расійскай мовах.

Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.
Друкуецца пры падтрымцы аднадумцаў.
Распаўсюджваецца бясплатна дабраахвотнікамі.